**Журнал Белорусского государственного университета. Филология. 2018;3:100–109**
**Journal of the Belarusian State University. Philology. 2018;3:100–109**

*УДК 81'367.628=811.16*

# КОММУНИКАТИВНЫЕ ФУНКЦИИ СИНТАКСИЧЕСКИ НЕЧЛЕНИМОГО ВЫСКАЗЫВАНИЯ «ХОРОШО» (НА МАТЕРИАЛЕ СЛАВЯНСКИХ ЯЗЫКОВ)

***А. П. ЛАТУШКО***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассмотрены коммуникативные функции синтаксически нечленимого высказывания *Хорошо* в белорусском, украинском, чешском и болгарском языках. Создана классификация видов согласия и описаны группы, в которые может входить это высказывание (например, торопливое согласие, согласие-успокаивание, одобрение, согласие-сомнение и т. д.). Синтаксически нечленимое высказывание *Хорошо* представлено вместе с вариантами и семантическими эквивалентами в четырех славянских языках, приведены контексты его употребления, обнаруженные на материале драматургических и прозаических произведений. Сделаны выводы о близости функций этой синтаксической единицы в славянских языках, выявлены особенности ее образования и употребления, продемонстрирована полифункциональность указанного высказывания. Результаты работы сведены в таблицу, где представлены синтаксически нечленимое высказывание *Хорошо* и его варианты в группах согласия, в которых они были зафиксированы, для каждого анализируемого языка.

***Ключевые слова:*** коммуникативная функция; междометие; речевой акт согласия; синтаксис; синтаксически нечленимое высказывание; славянские языки; согласие.

# КАМУНІКАТЫЎНЫЯ ФУНКЦЫІ СІНТАКСІЧНА НЯЧЛЕННАГА ВЫКАЗВАННЯ «ДОБРА» (НА МАТЭРЫЯЛЕ СЛАВЯНСКІХ МОЎ)

***Г. П. ЛАТУШКА***[1*]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Разгледжаны камунікатыўныя функцыі сінтаксічна нячленнага выказвання *Добра* ў беларускай, украінскай, чэшскай і балгарскай мовах. Створана класіфікацыя відаў згоды і апісаны групы, у якія можа ўваходзіць гэта выказванне (паспешлівая згода, згода-супакойванне, адабрэнне, згода-сумненне і г. д.). Сінтаксічна нячленнае выказванне *Добра* прадстаўлена разам з варыянтамі і семантычнымі эквівалентамі ў чатырох славянскіх мовах, прыведзены кантэксты яго ўжывання ў драматургічных і празаічных творах. Зроблены высновы пра блізкасць функцый гэтай сінтаксічнай адзінкі ў славянскіх мовах, выяўлены адметнасці яе ўтварэння і ўжывання, прадэманстравана поліфункцыянальнасць выказвання. Вынікі работы зведзены ў табліцу, дзе рэпрэзентаваны сінтаксічна нячленнае выказванне *Добра* і яго варыянты ў групах згоды, у якіх яны сустрэліся, для кожнай аналізуемай мовы.

***Ключавыя словы:*** выклічнік; камунікатыўная функцыя; згода; маўленчы акт згоды; сінтаксіс; сінтаксічна нячленнае выказванне; славянскія мовы.

**Образец цитирования:**
Латушка ГП. Камунікатыўныя функцыі сінтаксічна нячленнага выказвання «Добра» (на матэрыяле славянскіх моў). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія*. 2018;3:100–109.

**For citation:**
Latushka HP. Communicative functions of syntactically indivisible utterance «Good» (based on the material of the Slavic languages). *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2018;3:100–109. Belarusian.

**Автор:**
***Анна Петровна Латушко*** – аспирантка кафедры теоретического и славянского языкознания филологического факультета. Научный руководитель – доктор филологических наук, профессор Б. Ю. Норман.

**Author:**
***Hanna P. Latushka***, postgraduate student at the department of theoretical and Slavic linguistics, faculty of philology.
*sirotkina_ann@mail.ru*

# COMMUNICATIVE FUNCTIONS OF SYNTACTICALLY INDIVISIBLE UTTERANCE «GOOD» (BASED ON THE MATERIAL OF THE SLAVIC LANGUAGES)

*H. P. LATUSHKA*[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

Communicative functions of syntactically indivisible utterance *Good* in the Belarusian, Ukrainian, Czech and Bulgarian languages were considered. The classification of agreement was created and the groups of agreement that include *Good* (for example, hurried agreement, agreement with reassurance, approval, agreement with doubt, etc.) were described. Syntactically indivisible utterance *Good* together with alternants and semantic equivalents was presented. Contexts of usage *Good* based on the material of dramaturgic works were adduced also. The features of *Good* usage in each of the analyzed language were described. Conclusions about similarity and differences of *Good* functioning in the Slavic languages were made, polyfunctionality of utterance was demonstrated. The results of the work were summarized in the table which represent syntactically indivisible utterance *Good*, its alternants and the groups of agreement in which they were detected for each of the analyzed language.

***Key words:*** agreement; communicative function; interjection; Slavic languages; speech act of agreement; syntactically indivisible utterance; syntax.

Аб’ектам нашага даследавання выступаюць сінтаксічна нячленныя выказванні (далей – СНВ) з лексемай *добра* (укр. *добре*, чэш. *dobře*, балг. *добре*) у славянскіх мовах. Пад СНВ мы разумеем кароткія інтанацыйна аформленыя выказванні, якія звычайна ўжываюцца ў дыялогу, складаюцца з аднаго слова ці ўстойлівага спалучэння слоў і служаць для выражэння мадальных і экспрэсіўных адносін, напрыклад: *Так*; *Яшчэ чаго*; *Абавязкова*; *Канечне*; *Без пытанняў* і г. д. Акрэсленая тэма пакуль не так шырока распрацавана ў беларускай лінгвістыцы, але існуюць асобныя работы па названай праблеме і сумежных з ёй пытаннях [1–7]. У рускай лінгвістыцы СНВ актыўна вывучаюцца, ствараюцца слоўнікі названых адзінак, манаграфіі, дысертацыі, публікуюцца шматлікія артыкулы, прысвечаныя іх даследаванню (гл., напрыклад, [8–10]). Тым не менш многія праблемы, якія датычацца СНВ, застаюцца нявырашанымі.

У межах гэтай работы мы параўналі СНВ згоды, ядзернай лексемай у якіх з’яўляецца слова *добра*, у беларускай, украінскай, чэшскай, балгарскай мовах і паспрабавалі высветліць, у чым заключаюцца іх падабенства і адрозненні. Матэрыялам для даследавання паслужылі тэксты драматургіі і прозы на названых мовах апошніх 50 гадоў (гл. дадатак). У кожнай аналізуемай мове намі былі сабраны каля 1000–1100 мікрадыялогаў, у якіх ужыты СНВ для выражэння згоды і нязгоды.

СНВ для выражэння згоды мы раздзялілі на некалькі семантычных груп у залежнасці ад паўнаты згоды, а таксама ад таго, якая эмоцыя ці адценне значэння спадарожнічаюць выказванню. СНВ з лексемай *добра* зафіксаваны намі ў наступных групах згоды:

- паспешлівая згода (адрасат як мага хутчэй намагаецца заверыць адрасанта ў патрэбнай інфармацыі);
- згода-супакойванне (моўца намагаецца супакоіць, падтрымаць суразмоўцу);
- самапацвярджэнне (ужываецца ў маналагічным маўленні для пацвярджэння ўласных слоў ці думак);
- адабрэнне (перадае станоўчую ацэнку, падтрымку, адабрэнне);
- згода-пабуджэнне (ужываецца для падбадзёрвання, падштурхоўвання да дзеяння);
- згода-кантакт (выкарыстоўваецца не столькі для перадачы згоды, колькі для падтрымання кантакту ў дыялогу, стымулюе моўцу весці аповед далей, дэманструе, што слухач застаецца на сувязі і бярэ сказанае да ўвагі; можа сведчыць пра з’яўленне ў свядомасці моўцы новай думкі, ідэі, пра змену тэмы, завяршэнне дыялогу);
- згода-сумненне (моўца выказвае згоду, але ў ёй адчуваецца сумненне, няўпэўненасць, якія спадарожнічаюць (папярэднічаюць) СНВ);
- згода-дапушчэнне (моўца лічыць варыянт, прапанаваны суразмоўцам, дапушчальным, дарэчным, але выказвае пэўнае сумненне, ваганне);
- вымушаная згода (пагадзіцца насуперак уласнаму жаданню моўцу вымушаюць абставіны ці суразмоўца);
- згода-прымірэнне (моўца пагаджаецца, каб захаваць добрыя адносіны з суразмоўцам, не раззлаваць і не пакрыўдзіць яго, супакоіць);

• згода-задуменнасць (характарызуецца няўважлівасцю; моўца часта выказвае такую згоду, думаючы пра нешта сваё, не слухаючы, пра што гаворыць суразмоўца, для падтрымання кантакту);

• згода-пагроза (перадае не столькі згоду, колькі вымушанае прыняцце інфармацыі, якая суправаджаецца негатыўнай рэакцыяй і жаданнем прыстрашыць суразмоўцу, напалохаць яго);

• згода-незадаволенасць (адначасова з пацвярджэннем перадае незадаволенасць, раздражненне моўцы);

• згода-абыякавасць (адлюстроўвае незацікаўленасць моўцы разам са згодай або без яе).

СНВ *Добра* было намі зафіксавана таксама ў падгрупе «перарыванне камунікацыі (дзеяння)», у якой гэтыя моўныя адзінкі ўжываюцца для перапынення (часта рэзкага, грубага, прастамоўнага) рэплікі суразмоўцы і якая адносіцца да **нязгоды.**

Разгледзім прыклады ўжывання СНВ згоды ў вылучаных групах у розных мовах, а таксама варыянты названай адзінкі і некаторыя эквівалентныя выразы.

У беларускай мове СНВ *Добра* фігуруе ў 8 групах:

• **паспешлівая згода:** <Ну,> добра, добра (*Кірыла зразумеў, што зрабіў не той паварот і не так, як трэба, зліслівіў перад жонкай. –* «***Ну, добра, добра.*** *Не злуй*» (І. Шамякін. Сэрца на далоні));

• **згода-супакойванне:** <Ну,> добра, добра (*Мне страшна адной... –* ***Ну, добра, добра,*** *я з табой пабуду* (А. Макаёнак. Пагарэльцы));

• **адабрэнне:** Добра (*Сёння ж выпраўлю дачку ў замак з падарункамі. –* ***Добра.*** *Будзем чакаць* (У. Сіўчыкаў. Філасофскі камень); <О> то добра («*Трохі счакаем, – сказаў я. – Зараз прынясуць закусь*». – «***То добра***» (В. Быкаў. Пакахай мяне, салдацік); Ну то добра, калі так (*Яны не крыўдзяць. Яны для мяне як бацькі. –* ***Ну то добра, калі так*** (В. Быкаў. Пакахай мяне, салдацік); <Ну,> вось і добра/слаўна/цудоўна (*Паднімуся… (Устае з падлогі.) –* ***Вось і добра*** (А. Петрашкевіч. Напісанае застаецца));

• **згода-дапушчэнне:** Ну добра («*Грошай амаль не было, фраў заклала ў банк свае завушніцы, брошку. Тут, праўда, спадчыну атрымалі*». – «***Ну добра,*** *– сказаў я. – А мова? Дзе ты так навучылася па-нямецку? У школе?*» (В. Быкаў. Пакахай мяне, салдацік));

• **вымушаная згода:** Ну добра (*У гэты аўтобус ты ўсё адно не ўваб'ешся. А ўлезеш – патрушчаць рэбры. –* ***Ну добра.*** *Пайшлі* (І. Шамякін. Сэрца на далоні));

• **згода-прымірэнне:** Ну, добра, (добра) (*Я яе* [*кабылу*] *у цыганоў купіў! – Гэтак?* ***Ну, добра,*** *Хвєдзя, не будзем спрачацца* (П. Васючэнка. Хведар Набілкін – беларускі касінер));

• **згода-пагроза:** Добра (*Вярніцеся! Чуеце?* ***Добра…*** *Мы зробім з гэтай выхадкі пэўны вывад* (М. Матукоўскі. Амністыя));

• **згода-абыякавасць:** Ну і добра (*Уцёк, спрытнюга! –* ***Ну і добра.*** *Значыцца, жывы* (С. Кавалёў. Хохлік)).

У семантычным плане СНВ *Добра* – вельмі складаная адзінка, бо па форме яна выражае адабрэнне, але ў дыялогу звычайна набывае іншыя функцыі. Паводле нашых назіранняў, яна часцей ужываецца ў значэнні пацвярджэння, дазволу, таму яе аднесенасць да групы адабрэння дастаткова ўмоўная. Кажучы *Добра*, моўца быццам бы наважваецца на нешта. Так, у дыялогу *Я паеду з табой! –* ***Добра.*** *Ідзі збірай валізу* – вылучанае СНВ, хутчэй, перадае не ўхваленне ('Гэта добра, што ты са мной паедзеш'), а дазвол ('Я згодны, я дазваляю табе са мной ехаць'). Праблема заключаецца не толькі ў тым, што мы не можам дакладна ведаць, што хацеў сказаць адрасат, але і ў тым, што даволі часта адабрэнне, пацвярджэнне, дазвол яднаюцца ў СНВ, прычым у адным выпадку можа выражацца большая доля адабрэння, у другім – згоды. Акрамя таго, гэтыя значэнні часта пераплятаюцца з іншымі: СНВ *Добра* можа сведчыць аб прыняцці да ўвагі пачутай інфармацыі, з'яўленні ў свядомасці моўцы новай думкі, аб падтрыманні кантакту і г. д. Увогуле ж СНВ *Добра* – дастаткова спрэчная адзінка, бо знешне станоўчая форма можа выражаць і нязгоду, крыўду, незадаволенасць ды іншыя негатыўныя эмоцыі.

У беларускай мове да лексемы *добра* часта дадаецца часціца *ну*, якая можа прыўносіць значэнне сумнення, вагання, вымушанасці, змякчэння, прымірэння і інш. Узмацненне адзінкі звычайна адбываецца або з дапамогай пунктуацыі (клічнік) ці правапісу (вялікія літары), або ў выніку падвойнага (рэдка – патройнага) ужывання адзінкі (такія ж прынцыпы ўзмацнення дзейнічаюць і ў іншых аналізуемых мовах). Найбольш распаўсюджаныя ўстойлівыя адзінкі, у якія ўваходзіць лексема *добра*, – *Вось і добра*; *Ну і добра*; *Ну добра, калі так*.

Ва ўкраінскай мове СНВ *Добре* і яго варыянты былі зафіксаваны намі ў наступных 9 групах:

• **згода-супакойванне:** Добре, добре (*Але у таких компаніях є дрес-код. Дотримуйся його. Я тебе рекомендував, і я не хочу, щоб потім мене вичитували як двієчника. –* ***Добре, добре.*** *Буду старатися. Одяг на крайняк у Ольки візьму* (Н. Уварова. Шахрайки));

• **адабрэнне:** Добре (*Марія Романівна, я до вас. –* ***Добре*** (Н. Уварова. Коли настане весна)); Дуже добре (*Пан Томаш, я повідомив панові Роману ваше рішення. –* ***Дуже добре*** (Н. Уварова. Коли настане

весна); От/ото і/й добре/прекрасно/чудово (*Ми вже працюємо над цим. – **От і добре*** (В. Тарасенко. Купіть місячну доріжку); Це/то <вже> добре (*Я буду чинити опір! – **Це добре*** (С. Щученко. Релікт));

• **згода-кантакт:** Добре (*Ти ж, напевно, обіцяв одружитися? – (Зітхає, розводячи руками.) А тепер невідомо, що з нею робити. – **Добре,** давай про більш погане* (А. Наумов. Кава для чудовиська));

• **вымушаная згода:** Добре (*Де дві такі жінки, як ми з Вікою, – там подвійні стіни. – **Добре,** переконали* (А. Наумов. Пацієнтка найкращого хірурга));

• **згода-задуменнасць:** Добре (*Три літери. Т. А. К. Так. А? – Ну, знаєш… Хоча, все одно зворушливо. ТАК. Три літери. Одне слово. Маленьке, але симпатичне (Посміхається.) **Добре.** Дарую* (С. Щученко. *Help*));

• **згода-пагроза:** Добре (*Іди. – (Зіскакує з постаменту, зло.) **Добре.** Я піду* (С. Щученко. Без коня));

• **згода-абыякавасць:** Ну <то> й добре (*Хочеш шоколадку? – Що таке шоколадка? – **Ну то й добре*** (С. Щученко. Релікт)).

Украінскае СНВ *Добре* ўжываецца ў тых жа сітуацыях і выконвае тыя ж функцыі, што і беларуская адзінка. Да яго дадаюцца падобныя часціцы (*ну*, *о*), утвараюцца аналагічныя маўленчыя формулы: *Дуже добре*; *Це добре*; *То добре*; *От і добре*; *Добре-добре – Дужа добра*; *Гэта добра*; *То добра*; *Вось і добра*; *Добра-добра*.

Сваю функцыю СНВ *Добре* страчвае ў групе «згода-кантакт». Падобныя выразы ўжываюцца ва ўсіх аналізуемых мовах (у беларускім матэрыяле сярод 1100 мікрадыялогаў такі прыклад мы не зафіксавалі, але яго можна лёгка сканструяваць). Адносна падобных адзінак у рускай мове Г. Я. Крэйдлін і А. М. Баранаў адзначалі: «Некоторые семантически полнозначные слова и сочетания слов приобретают в диалоге чисто синтаксические функции. Они маркируют выполнение отношений иллокутивного вынуждения (или самовынуждения) в предшествующей МДЕ (минимальной диалогической единице. – *Г. Л.*)» [11, с. 87]. Даследчыкі прыводзяць вядомы анекдот: *Хворы, як вы сябе адчуваеце? – Дрэнна, доктар. – Ну, добра…* Выраз *Ну, добра* ў гэтым кантэксце абазначае прыняцце інфармацыі да ўвагі і завяршанасць папярэдняга мінімальнага дыялогу.

Значнае адрозненне паміж беларускімі і ўкраінскімі адзінкамі згоды выяўляецца ў тым, што ва ўкраінскай мове ёсць два паралельныя выразы для перадачы згоды – *Добре* і *Гаразд*, якія не адрозніваюцца па стылі ўжывання, функцыях і частотнасці. Абедзве адзінкі былі зафіксаваны намі прыблізна ў аднолькавай колькасці дыялогаў у творах розных аўтараў у маўленні персанажаў рознага ўзросту. Лексема *гаразд* ужываецца ў такіх групах згоды, як паспешлівая згода, адабрэнне, згода-кантакт, згода-дапушчэнне, вымушаная згода, згода-пагроза. Адзінае адрозненне, якое можна заўважыць паміж дзвюма лексемамі, заключаецца ў тым, што слова *гаразд* не ўтварае ўстойлівых выразаў і не так актыўна далучае да сябе часціцы (мы выявілі спалучэнні *Ну гаразд* і *О, гаразд*). Лексема *добре* валодае большай спалучальнасцю, яна можа ўваходзіць у склад СНВ разам з іншымі словамі.

У чэшскай мове СНВ *Dobře* і яго прастамоўныя варыянты *Dobrá* і *Dobrý* выступаюць у 7 групах згоды:

• **паспешлівая згода:** <No> dobře, dobře (*Chápejte mě – pamatuji vás jako tříletého caparta, – sama děti nemám. – **No dobře, dobře,** děkuji vám za vaši starost, chápu ji a vážím si ji, myslím ale, že v tomhle případě skutečně není na místě* ‘«Зразумейце мяне – памятаю вас як трохгадовага карапуза, – у мяне самой дзяцей няма». – «**Ну добра, добра,** я дзякую вам за вашу турботу, разумею яе і паважаю, але думаю, што ў дадзеным выпадку яна сапраўды не да месца»’[1] (V. Havel. Pokoušení));

• **згода-супакойванне:** Dobře! Dobře! (*«Chceš tedy krvavou svatbu?» – křičel otec. – «**Dobře! Dobře!**»* ‘«Ты хочаш крывавае вяселле?» – крычаў бацька. – «**Добра! Добра!**»’ (M. Viewegh. Báječná léta pod psa));

• **згода-адабрэнне:** <No/tak> dobře (*Poradím si sama. – **Tak dobře.** (Obejme ji a dlouze políbí.)* ‘«Я спраўлюся сама». – **«Ну добра».** *(Абдымае яе і доўга цалуе.)*’ (M. Uhde. Balada pro banditu));

• **згода-кантакт:** <Tak> dobře (*Zemská správa řekla: živého nebo mrtvého. – **Dobře,** nechme toho. Kolik měl u sebe?* ‘«Абласная адміністрацыя сказала: жывога ці мёртвага». – «**Добра,** пакінем гэта. Колькі ў яго было з сабой?»’ (M. Uhde. Balada pro banditu));

• **згода-дапушчэнне:** No dobře (*Ono je to těžký soudit, tehdy tady panovaly naprosto nepředstavitelný podmínky. – **No dobře,** ale pořád kvůli tomu nemusím schvalovat vraždy, ne?* ‘«Цяжка судзіць, тут былі проста неймаверныя ўмовы». – «**Ну добра,** але ж я праз гэта не павінен падтрымлівасць забойствы, не?»’ (M. Uhde. Balada pro banditu));

• **вымушаная згода:** <No/ tak> dobře (*V očích měla netajený odpor, ale její ústa se téměř usmívala. «**Dobře,**» řekla bezbarvě. «Pojedu s vámi»* ‘У яе вачах быў непрыхаваны супраціў, але яе вусны амаль усміхаліся. «**Добра,** – сказала яна абыякава. – Я паеду з вамі»’ (M. Urban. Hastrman)).

[1]Тут і далей пераклад наш. – *Г. Л.*

Варыянт СНВ *Dobrá* ўжываецца паралельна з адзінкай *Dobře*:

• **згода-супакойванне:** Dobrá, dobrá (*Tak sakra! Říkám ti, že – (Chlácholivě.)* ***Dobrá, dobrá,*** *klid... Co dělá Paco?* «Ах чорт! Кажу табе, што…» – *(Супакойваючы.)* «**Добра, добра,** спакойна… Што робіць Пака?» (M. Viewegh. Báječná léta pod psa));

• **згода-адабрэнне:** <Nuže/tak> dobrá (*Prosíte? Opravdu prosíte? – No jo. –* ***Tak dobrá.*** *Kde jsem to přestal?* ‘«Вы просіце? Сапраўды просіце?» – «Ну так». – «**Тады добра.** На чым я спыніўся?»’ (M. Kundera. Jakub a jeho pán));

• **згода-кантакт:** Dobrá (*Pořád ještě nerozumíte? – Ne. –* ***Dobrá,*** *tak vám to řeknu* přímo... ‘«Вы ўсё яшчэ не разумееце?» – «Не». – «**Добра,** дык я вам скажу наўпрост…»’ (V. Havel. Pokoušení));

• **згода-сумненне:** Dobrá (*Doporučuji vám třetí alternative. (Foustka přechází zamyšleně po místnosti, posléze usedne za svůj stůl a pohlédne na Fistulu.) –* ***Dobrá,*** *přijímám ji, ovšem s dodatkem, že se nemusím v hovoru s vámi nijak kontrolovat či omezovat, protože u mne nepřipadá v úvahu, že bych si mohl myslet a tím spíš vyslovit něco, co by bylo proti mně jakkoli použitelné* ‘«Раю вам трэцюю альтэрнатыву». *(Фоўстка праходзіцца задумліва па пакоі, пасля ўсаджваецца за свой стол і глядзіць на Фістулу.)* – «**Добра,** прымаю яе, аднак з дадаткам, што я не мушу ў размове з вамі сябе ніяк кантраляваць ці абмяжоўваць, таму што мне не спадае на розум, каб я мог думаць і тым больш сказаць штосьці, што магло б неяк ужывацца супраць мяне»’ (V. Havel. Pokoušení));

• **вымушаная згода:** No dobrá (*Domů si přátele nezvu a knihy zásadně nikomu nepůjčuji. –* ***No dobrá*** ‘«Да сябе дамоў прыяцеляў не клічу і кнігі прынцыпова нікому не пазычаю». – **«Ну добра»**’ (V. Havel. Pokoušení)).

Варыянт СНВ *Dobrý* сустрэўся толькі ў адной групе:

• **згода-дапушчэнне:** No dobrý (*«Jenomže kdo rodí děti? Ženský!» Významně se nad tou moudrostí zasměju, nicméně Mojmír o Felixově myšlenkovém výronu vážně přemítá. Náhle pochopím, kam Felixova tiráda směřuje – a nemůžu uvěřit vlastním uším. «****No dobrý*** *– a co maj teda český ženský v genech?» ptá se mezitím Mojmír Felixe* ‘«Толькі ж хто нараджае дзяцей? Жанчыны!» Я з гэтай мудрасці шчыра засмяюся, зрэшты, Моймір над усплёскам думак Фелікса разважае. Нечакана я разумею, куды трыяда Фелікса скіроўваецца – і не магу паверыць уласным вушам. «**Ну добра,** а што ж маюць чэшскія жанчына ў генах?» – запытваецца між тым Моймір у Фелікса’ (M. Viewegh. Biomanžel)).

Вусная і пісьмовая формы маўлення ў чэшскай мове прадстаўлены дзвюма асноўнымі разнавіднасцямі – літаратурнай мовай (*spisovná čeština* – больш строгая форма, якая ўжываецца ў афіцыйных зносінах) і прастамоўем (*obecná čeština* – форма чэшскай мовы, якая ўжываецца ў неафіцыйных сферах): «Обиходно-разговорный чешский язык отличается от литературного чешского языка рядом особенностей – фонетических, морфологических, синтаксических и лексических. Эти особенности характеризуют не только устную разговорную речь, но нередко (в разной степени) проникают и в язык художественных произведений, главным образом в язык персонажей из народа» [12, с. 339]. Варта таксама дадаць, што літаратурная чэшская мова мае прамежкавую, пераходную форму на шляху да так званага чэшскага прастамоўя – гэта размоўная форма мовы (*hovorová čeština*). Як *obecná čeština*, так і *hovorová čeština* значна адрозніваюцца ад літаратурнай мовы і маюць асаблівасці на розных моўных узроўнях. Чэшскае прастамоўе (*obecná čeština*) часта сведчыць пра больш даверлівыя, таварыскія адносіны паміж суразмоўцамі або пра тое, што яны прынамсі знаёмыя. Дзякуючы выкарыстанню дзвюх гэтых разнавіднасцей чэшскай мовы павялічваецца і колькасць варыянтаў СНВ. Часам яны могуць адрозніваца лексічна, а часам фанетычна і (ці) граматычна: *Dobře – Dobrá*, *Dobrý*. Названыя формы чэшскай мовы могуць чаргавацца ў размове ў залежнасці ад таго, хто з’яўляецца суразмоўцам, часам коды могуць пераплятацца, што прыводзіць да пранікнення размоўных элементаў у афіцыйную сферу зносін [13, с. 81].

Больш строгія правілы пабудовы сказа ў чэшскай мове (прынамсі, у яе літаратурнай разнавіднасці) абумоўліваюць тое, што для перадачы згоды ў ёй часцей ужываюцца члянімыя выказванні ў тых выпадках, дзе ва ўсходнеславянскіх мовах выкарыстоўваюцца СНВ [14, с. 237–238]. Гэта звязана і з тыпалагічнымі адрозненнямі паміж славянскімі мовамі [15, с. 206–207]. Названыя фактары ўплываюць на наяўнасць у чэшскай мове паралельных форм выказвання – члянімых і нячленных, напрыклад: *To je dobré – Dobře* (*Havíři mu říkali Popelka. –* ***To je dobré,*** *řekl redaktor* ‘«Шахцёры клікалі яго Папялушкай». – «Гэта добра», – сказаў рэдактар’ (M. Viewegh. Báječná léta pod psa).

У прааналізаваных чэшскіх творах мы не зафіксавалі ўстойлівых спалучэнняў з лексемай *dobře*. Найбольш часта да яе дадаюцца часціцы *no*, *tak*.

Балгарскія СНВ з лексемай *добре* фігуруюць у 13 групах згоды:

• **паспешлівая згода:** Добре, <де> добре; добре, добре-добре (*Гащите! Бързо! (Тика пистолета в корема му.) Айде! –* ***Добре, добре!*** *(Събува си гащите)* ‘«Штаны! Хутка! *(Тыкае пісталетам*

*яму ў жывот.)* Ну-ка!» – «**Добра, добра!**» *(Здымае штаны.)*’ (С. Кисьов. Глaруси));

• **згода-супакойванне:** Добре <де>, (добре) (*Това беше най-хубавият ми спомен... А сега ти ми го отне. – Да, добре, добре, извинявай...* ‘«Гэта быў мой найлепшы ўспамін… А зараз ты ў мяне яго адняў». – «Так, **добра, добра,** выбачай…»’ (П. Антов. Само една малка смърт));

• **самапацвярджэнне:** Добре (*Чакайте, не казахте нищо! – Нали трябваше да извадя делото – извадих го. Много интересно дело. Всичко наред ли е вече? Да?* ***Добре.*** *Всичко хубаво. Имам да пазарувам... Да. Довиждане* ‘«Чакайце, вы нічога не сказалі!» – «Я ж павінен быў дастаць справу – я дастаў яе. Вельмі цікавая справа. Зараз усё ў парадку? Так? **Добра.** Усяго добрага. Мне трэба за пакупкамі… Так. Да пабачэння!»’ (М. Донева. Пепеляшка));

• **адабрэнне:** <А-а-а/е> добре <бе/де>; добре, добре (*Попитах – как? – Чрез гласуване. –* ***Добре****... Точен отговор!..* ‘«Я запытаўся – як?» – «Галасаваннем». – «**Добра…** Гэта дакладны адказ!»’ (Б. Ценов. Разкованият човек));

• **згода-пабуджэнне:** <Много> добре, <много> добре (*Свирех... Биех дузпи... – (Като психиатър.) Така, така... Значи бием дузпи...* ***Много добре, много добре...*** ‘«Я граў… Біў штрафныя…» – *(Тонам псіхіятра.)* «Так, так… Значыцца штрафныя б’ём… **Вельмі добра, вельмі добра…**»’ (Н. Нанков. Дворчето));

• **згода-кантакт:** <Ами> добре <де> (*Беше обещал да ми помогне, но ме измами. – Как? (Елена поклаща глава. Бъчваров въздъхва.) –* ***Добре де,*** *защо трябваше да го следим?* ‘«Ён абяцаў мне дапамагчы, але падмануў». – «Як гэта?» *(Алена круціць галавой. Бычвараў уздыхае.)* – «**Ну добра,** а чаму нам трэба было за ім сачыць?»’ (В. Топлийски. Из «Кутията на Пандора, или сваляй гащите»));

• **згода-сумненне:** Добре (*Трябва да бъдеш категорична и сигурна, че искаш да чуеш откровеното ми мнение. Ако не го искаш категорично, по-добре да не казвам нищо. – (Колебае се.)* ***Добре.*** *(Поуверено) Добре. Готова съм* ‘«Ты павінна быць катэгарычнай і ўпэўненай, што хочаш пачуць маё шчырае меркаванне. Калі катэгарычнае табе не падабаецца, лепш я не буду казаць нічога». – *(Вагаецца.)* «**Добра**. *(Больш упэўнена.)* Добра. Я гатовая»’ (Г. Милев. Безхарактерност));

• **згода-дапушчэнне:** Добре (*Внимавай! (Взема от ръцете на приятеля си ралника и показва.) Така! Ръката – над резеца преминава, а не налита срещу него... Земята това най-много чака!.. А чопленето на пръстта с играчки от дърво (Върти глава.) – само мъка и тегло, нищо повече! –* ***Добре...*** *но докога така!... Реколтата все по-слаба, а смъртните? Отписали ли сме го?* ‘«Глядзі! *(Бярэ з рук прыяцеля нарог і паказвае.)* Вось так! Рука – праходзіць над вастрыём, а не ціснe на яго… Зямля гэтага больш за ўсё чакае!.. А калупаць зямлю драўлянымі цацкамі *(круціць галавой)* – толькі мука і пакута, нічога больш!» – «**Добра…** але да якіх часоў так? Ураджаі ўсё горшыя, а людзі?»’ (Б. Ценов. Разкованият човек));

• **вымушаная згода:** <Е> добре <де> (*Млъкни, безпризорно псе! –* ***Добре,*** *млъквам* ‘«Змоўкні, беспародны сабака!» – «**Добра, змаўкаю**»’ (А. Стойчев. Плебеи и аристократи));

• **згода-прымірэнне:** <Е> добре <де>; добре, добре (*Престорих се, че не съм чул или не съм обърнал внимание на думите ти. А по-късно, когато останах сам, плаках. –* ***Добре де,*** *казах вече, че съжалявам* ‘«Я зрабіў выгляд, што не чуў ці не звярнуў увагі на твае словы. А пасля, калі застаўся адзін, я плакаў». – «**Ну добра,** я ўжо казаў, што шкадую»’ (П. Антов. Само една малка смърт));

• **згода-пагроза:** Добре (*Отвсякъде се вижда какво точно е Пандора, без съмнение. –* ***Добре...*** *Другояче ще попитам: кой принуди боговете на Олимп да откъснат от своите дарби, да ги прибавиш към вода и пръст и да замесиш невиждано тесто?* ‘«Гэта адусюль бачна, што ўяўляе сабой Пандора, сумнення няма». – «**Добра…** Запытаюся па-іншаму: хто прымусіў багоў на Алімпе адшчыкнуць ад сваіх талентаў, каб дадаць гэта да вады і гліны ды замясіць незвычайнае цеста?»’ (Б. Ценов. Разкованият човек));

• **згода-незадаволенасць:** Добре (*Това си е жив тероризъм! Нали правят така непрекъснато и още по-лошо става. –* ***Добре,*** *ти кво предлагаш?* ‘«Гэта сапраўдны тэрарызм! Яны ж гэта робяць бесперастанку, і становіцца ўсё горш». – «**Добра,** што ты прапануеш?»’ (Е. Андреев. Да убиеш премиер));

• **згода-абыякавасць:** Добре (*Кажи ми как стигна дотук? – Майната ти. –* ***Добре,*** *не ми казвай* ‘«Скажы мне, як да гэтага дайшло?» – «Каб цябе халера». – «**Добра,** не кажы»’ (Г. Михалков. Игра на просяци));

Балгарскае СНВ *Добре* таксама было зафіксавана сярод адзінак для выражэння нязгоды:

• **перарыванне камунікацыі (дзеяння):** Добре, добре (*(До този момент са наблюдавали новата игра, сега и те искат да пият от стомничката.) Пиууу! Пюу-пюу-пюууу! Пи-пи-пи-пи! –* ***Добре, добре,*** *Пивенца! Разбрах, че и вие искате да пиете водичка!* ‘*(Да гэтага моманту яны сачылі за новай гульнёй, а зараз і яны хочуць папіць з пасудзіны.)* «Піууу! Пюу-пюу-пюууу! Пі-пі-пі-пі!» – «**Добра, добра,** птушачкі! Я зразумела, што і вам хочацца вадзічкі!»’ (Т. Шелхорн. Черното биволче)).

На фарміраванне балгарскай літаратурнай мовы паўплывала народнае маўленне, што абумовіла наяўнасць вялікай колькасці прэпазітыўных і постпазітыўных часціц пры СНВ. У іншых разгледжаных намі мовах такія часціцы таксама ёсць (напрыклад, бел. *ах*, *ой*, *эх*, *о*, *а*, *ну*), але ў балгарскай мове яны сустракаюцца часцей і часам надаюць амаль незаўважныя адценні значэнняў. Напрыклад, шырока ўжываюцца лексемы, якія ўзмацняюць выказванне: *ама*, *ами*, *е*, *де* і г. д. Яны могуць дадавацца і да СНВ згоды. Больш за тое, як сведчыць слоўнік, названыя часціцы могуць далучаць да сябе і іншыя часціцы, якія не ўплываюць на значэнне, напрыклад: *ама де*, *ама че*, *ама а*, *ама че а*, *ама ха*, *ама па* [16, с. 238], *ами сега*, *ами че и*, *ами че как* [16, с. 246]. У прааналізаваных кантэкстах часцей за іншыя сустракаюцца выразы *Добре де*; *Е*, *добре*. Ужываецца таксама ўстойлівае спалучэнне *Много добре*.

Як заўважна з прыкладаў на балгарскай мове, часам СНВ *Добре* можа функцыянаваць не толькі як згода-кантакт, але і для заканчэння дыялогу (дзеяння). Такія сітуацыі можна сустрэць і ў іншых аналізуемых мовах.

Функцыі СНВ *Добра* ў беларускай, украінскай, чэшскай і балгарскай мовах супастаўлены ў табліцы.

**Сінтаксічна нячленныя выказванні з лексемай *добра* ў славянскіх мовах**

**Syntactically indivisible utterances with lexeme *good* in the Slavic languages**

| Від згоды/нязгоды | Мова | | | |
|---|---|---|---|---|
| | беларуская | украінская | чэшская | балгарская |
| Поўная згода | | | | |
| Паспешлівая згода | <Ну,> добра, добра | – | <No> dobře, dobře | Добре, <де> добре; Добре, добре-добре |
| Згода-супакойванне | <Ну,> добра, добра | Добре, добре | Dobře! Dobře!; Dobrá, dobrá | Добре <де>, (добре) |
| Самапацвярджэнне | – | – | – | Добре |
| Адабрэнне | Добра; <О> то добра; Ну то добра, калі так; <Ну,> вось і добра/ слаўна/цудоўна | Добре; Дуже добре; От/ото і/й добре/ прекрасно/чудово; Це/то <вже> добре | <No/tak> dobře; <Nuže/tak> dobrá | <А-а-а/е> добре <бе/де>; Добре, добре |
| Згода-пабуджэнне | – | – | – | <Много> добре, <много> добре |
| Згода-кантакт | – | Добре | <Tak> dobře; Dobrá | <Ами> добре <де> |
| Няпоўная згода | | | | |
| Згода-сумненне | – | – | – | Добре |
| Згода-дапушчэнне | Ну добра | – | – | Добре |
| Вымушаная згода | Ну добра | Добре | – | <Е> добре <де> |
| Згода-прымірэнне | Ну, добра, (добра) | – | – | <Е> добре <де>; Добре, добре |
| Згода-задуменнасць | – | Добре | – | – |
| Згода-пагроза | Добра | Добре | – | Добре |
| Згода-незадаволенасць | – | – | – | Добре |
| Згода-абыякавасць | Ну і добра | Ну <то> й добре | – | Добре |
| Поўная нязгода | | | | |
| Перарыванне камунікацыі (дзеяння) | – | – | – | Добре, добре |

Такім чынам, СНВ *Добра* (укр. *Добре*, чэш. *Dobře*, балг. *Добре*) у дыялогу звычайна цалкам ці часткова дэсемантызуецца, перадаючы не столькі адабрэнне, колькі пацвярджэнне, дазвол і іншыя віды згоды. Названая адзінка мае мноства значэнняў – ад паспешлівай згоды да поўнай нязгоды (перарыванне камунікацыі/дзеяння). Часам з дапамогай СНВ *Добра* можа выражацца неадабрэнне, пагроза, абыякавасць і іншыя негатыўныя эмоцыі. У некаторых мовах гэта выказванне мае эквіваленты (напрыклад, цалкам эквівалентнае ўкраінскае СНВ *Гаразд*; чэшскія СНВ *Dobrá*, *Dobrý*), якія стылістычна адрозніваюцца ад нейтральнага варыянта *Dobře*. Найбольш блізкімі сярод аналізуемых з'яўляюцца беларускія і ўкраінскія маўленчыя формулы. Чэшская мова вылучаецца паралельным існаваннем чляніміх і нячленных выказванняў для выражэння згоды. У кожнай мове да лексемы *добра* могуць дадавацца іншыя словы (пераважна часціцы). У балгарскай мове гэта адбываецца часцей. І калі ў астатніх аналізуемых мовах новае значэнне перадаецца з дапамогай іншых СНВ, у балгарскай мове вялікая колькасць значэнняў укладваецца ў часціцы, якія далучаюцца да формул згоды і нязгоды.

*Дадатак*

## Крыніцы

1. *Быкаў В.* Пакахай мяне, салдацік // Сямнаццатай вясной. Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2010. С. 22–87.
2. *Васючэнка П.* Хведар Набілкін – беларускі касінер // Сучасная беларуская драматургія: традыцыі і наватарства. Мінск : ТАА «Сэр-Віт», 2003. С. 621–638.
3. *Кавалёў С.* Хохлік // Шлях да Бэтлеему. Мінск : Мастацкая літаратура, 2009. С. 3–15.
4. *Макаёнак А.* Пагарэльцы // Зацюканы апостал. Мінск : Мастацкая літаратура, 2006. С. 213–269.
5. *Матукоўскі М.* Амністыя // П'есы. Мінск : Мастацкая літаратура, 1979. С. 5–76.
6. *Петрашкевіч А.* Напісанае застаецца // Напісанае застаецца. Мінск : Мастацкая літаратура, 2011. С. 3–75.
7. *Сіўчыкаў У.* Філасофскі камень // Сучасная беларуская драматургія: традыцыі і наватарства. Мінск : ТАА «Сэр-Віт», 2003. С. 588–620.
8. *Шамякін І.* Сэрца на далоні. Мінск : Мастацкая літаратура, 2008.
9. *Havel V.* Pokoušení. Praha : Národní divadlo v Praze, 2004.
10. *Kundera M.* Jakub a jeho pán. Pocta denisi diderotovi. Brno : Atlantis, 2007.
11. *Uhde M., Štědroň M.* Balada pro banditu. Ostrava : Národní divadlo moravskoslezské, 2012.
12. *Urban M.* Hastrman: zelený roman. Praha : Argo, 2001.
13. *Viewegh M.* Báječná léta pod psa. Brno : Petrov, 1997.
14. *Viewegh M.* Biomanžel. Brno : Druhé město, 2015.
15. *Андреев Е.* Да убиеш премиер [Электронны рэсурс]. URL: https://liternet.bg/publish13/e_andreev/premier/index.html (дата звароту: 31.07.2018).
16. *Анто П.* Само една малка смърт [Электронны рэсурс]. URL: https://liternet.bg/publish11/p_antov/samo.htm (дата звароту: 31.07.2018).
17. *Донева М.* Пепеляшка [Электронны рэсурс]. URL: https://liternet.bg/publish7/mdoneva/pepeliashka.htm (дата звароту: 31.07.2018).
18. *Кисьов С.* Гларуси [Электронны рэсурс]. URL: https://liternet.bg/publish3/skisiov/glarusi/content.htm (дата звароту: 31.07.2018).
19. *Милев Г.* Безхарактерност [Электронны рэсурс]. URL: https://liternet.bg/publish5/gmilev/piesi/bezharakternost.htm (дата звароту: 31.07.2018).
20. *Михалков Г.* Игра на просяци [Электронны рэсурс]. URL: https://liternet.bg/publish13/g_mihalkov/igra.htm (дата звароту: 31.07.2018).
21. *Нанков Н.* Дворчето [Электронны рэсурс]. URL: https://liternet.bg/publish13/n_nankov/dvorcheto.htm (дата звароту: 31.07.2018).
22. *Наумов А.* Кава для чудовиська [Электронны рэсурс]. URL: http://ukrdrama.at.ua/load/anatolij_naumov_kava_dlja_chudoviska_abo_kava_dlja_perevirjajuchogo/5-1-0-37 (дата звароту: 31.07.2018).
23. *Наумов А.* Пацієнтка найкращого хірурга [Электронны рэсурс]. URL: http://ukrdrama.at.ua/load/anatolij_naumov_pacientka_najkrashhogo_khirurga/5-1-0-41 (дата звароту: 31.07.2018).
24. *Стойчев А.* Плебеи и аристократи [Электронны рэсурс]. URL: https://liternet.bg/publish28/atanas-stoychev/plebei.htm (дата звароту: 31.73.2018).
25. *Тарасенко В.* Купіть місячну доріжку [Электронны рэсурс]. URL: http://ukrdrama.at.ua/load/viktor_tarasenko_quot_kupit_misjacheu_dorizhku_quot/3-1-0-12 (дата звароту: 31.07.2018).
26. *Топлийски В.* Из «Кутията на Пандора или сваляй гащите» [Электронны рэсурс]. URL: https://liternet.bg/publish26/viktor-toplijski/pandora.htm (дата звароту: 31.07.2018).
27. *Уварова Н.* Коли настане весна [Электронны рэсурс]. URL: http://ukrdrama.at.ua/load/0-0-0-4-20 (дата звароту: 31.07.2018).
28. *Уварова Н.* Шахрайки [Электронны рэсурс]. URL: http://ukrdrama.at.ua/load/3-1-0-1 (дата звароту: 31.07.2018).
29. *Ценов Б.* Разкованият човек [Электронны рэсурс]. URL: https://liternet.bg/publish30/blagoj-cenov/razkovaniiat.htm (дата звароту: 31.07.2018).
30. *Шелхорн Т.* Черното биволче [Электронны рэсурс]. URL: https://liternet.bg/publish14/t_shelhorn/vuper/chernoto_bivolche/content.html (дата звароту: 31.07.2018).

31. *Щученк С.* Без коня [Электронны рэсурс]. URL: http://dramaturg.org.ua/%D0%BA%D0%BE%D0%BB%D0%B5%D0%BA%D1%86%D1%96%D1%8F-%D0%BC%D0%B0%D0%BB%D0%B5%D0%BD%D1%8C%D0%BA%D0%B8%D1%85-%D0%BF%D1%94%D1%81-%D0%B2%D1%96%D0%B4-%D1%81%D1%83%D1%87%D0%B0%D1%81%D0%BD%D0%BE%D0%B3/#.WywGM7xl_IU (дата звароту: 31.07.2018).

32. *Щученко С.* Рэлікт // Придурки [Электронны рэсурс]. URL: http://dramaturg.org.ua/%D0%BA%D0%BE%D0%BB%D0%B5%D0%BA%D1%86%D1%96%D1%8F-%D0%BC%D0%B0%D0%BB%D0%B5%D0%BD%D1%8C%D0%BA%D0%B8%D1%85-%D0%BF%D1%94%D1%81-%D0%B2%D1%96%D0%B4-%D1%81%D1%83%D1%87%D0%B0%D1%81%D0%BD%D0%BE%D0%B3/#.WywGM7xl_IU (дата звароту: 31.07.2018).

33. *Щученко С.* Help [Электронны рэсурс]. URL: http://dramaturg.org.ua/%D0%BD%D0%BE%D0%B2%D0%B0-%D0%BF%D1%94%D1%81%D0%B0-%D1%81%D1%83%D1%87%D0%B0%D1%81%D0%BD%D0%BE%D0%B3%D0%BE-%D1%83%D0%BA%D1%80%D0%B0%D1%97%D0%BD%D1%81%D1%8C%D0%BA%D0%BE%D0%B3%D0%BE-%D0%B4%D1%80%D0%B0/#axzz5J9HwB2qA (дата звароту: 31.07.2018).

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Норман БЮ. *Лингвистическая прагматика (на материале русского и других славянских языков)*. Минск: БГУ; 2009.
2. Рамза ТР. *Беларускае гутарковае маўленне: сучасны стан.* Мінск: Вышэйшая школа; 2011.
3. Доўгаль АВ. *Сродкі выражэння эмоцый у сучаснай беларускай мове.* Мінск: Тэхналогія; 2008.
4. Зур ГІ. Інтэр’ектыўныя выказванні беларускай мовы ў святле лінгвапрагматыкі. *Веснік Полацкага дзяржаўнага універсітэта. Серыя А: Гуманітарныя навукі.* 2013;10:111–114.
5. Лянкевіч АУ. *Беларускі выклічнік у Сеціве.* Мінск: Права і эканоміка; 2009.
6. Киселев ИА. *Частицы в современных восточнославянских языках*. Минск: БГУ; 1976.
7. Латушка ГП. Нязгода ў кантэксце эфектыўнай камунікацыі (на матэрыяле беларускіх драматургічных твораў). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Філалогія.* 2017;3:73–78.
8. Меликян ВЮ. *Эмоционально-экспрессивные обороты живой речи*. Москва: ФЛИНТА; 2001. Совместное издание с «Наука».
9. Земская ЕА. *Русская разговорная речь: лингвистический анализ и проблемы обучения.* Москва: ФЛИНТА; 2011. Совместное издание с «Наука».
10. Шаронов ИА. Коммуникативы как функциональный класс и как объект лексикографического описания. *Русистика сегодня.* 1996;2:89–111.
11. Баранов АН, Крейдлин ГЕ. Структура диалогического текста: лексические показатели минимальных диалогов. *Вопросы языкознания.* 1992;3:84–93.
12. Широкова АГ, Адамец П, Влчек И. *Чешский язык*. Москва: Высшая школа; 1988.
13. Karlík P, Nekula M, Pleskalová J. *Encyklopedický slovník češtiny*. Praha: Lidové noviny; 2002.
14. Матезиус В. О системном грамматическом анализе. В: Кондрашов НА, составитель, редактор. *Пражский лингвистический кружок*. Москва: Прогресс; 1967. с. 226–238.
15. Матезиус В. Попытка создания теории структурной грамматики. В: Кондрашов НА, составитель-редактор. *Пражский лингвистический кружок*. Москва: Прогресс; 1967. с. 196–209.
16. Чолакова К. *Речник на българския език. Том 1. А–Б*. София: Издателство на БАН; 1977.

## References

1. Norman BJ. *Lingvisticheskaya pragmatika (na materiale russkogo i drugikh slavyanskikh yazykov)* [Linguistic pragmatics (based on the material of Russian and other Slavic languages)]. Minsk: Belarusian State University; 2009. Russian.
2. Ramza TR. *Belaruskae gutarkovae mawlenne: suchasny stan* [Belarusian colloquial speech: the current state]. Minsk: Vyshjejshaja shkola; 2011. Belarusian.
3. Dougal AV. *Srodki vyrazhjennja jemocyj u suchasnaj belaruskaj move* [Ways to express emotions in the modern Belarusian language]. Minsk: Tjehnalogija; 2008. Belarusian.
4. Zur GI. [Interjection utterances of the Belarusian language through the prism of lingua-pragmatics]. *Vesnik Polackaga dzjarzhawnaga universitjeta. Seryja A: Gumanitarnyja navuki* [Vestnik of Polotsk State University. Series A: Humanities]. 2013;10:111–114. Belarusian.
5. Lyankevich AU. *Belaruski vyklichnik u Secive* [Belarusian interjection on the web]. Minsk: Prava i jekanomika; 2009. Belarusian.
6. Kiselyov IA. *Chastitsy v sovremennykh vostochnoslavyanskikh yazykakh* [Particle in the modern East Slavic languages]. Minsk: Belarusian State University; 1976. Russian.
7. Latushka HP. Disagreement in the context of effective communication (based on the material of Belarusian dramaturgic works). *Journal of the Belarusian State University. Philology.* 2017;3:73–78. Belarusian.
8. Melikyan VY. *Emotsional’no-ekspressivnye oboroty zhivoi rechi* [Emotional-expressive locutions in live speech]. Moscow: Flinta; 2001. Co-published by the «Nauka». Russian.
9. Zemskaya EA. *Russkaya razgovornaya rech’: lingvisticheskii analiz i problemy obucheniya* [Russian colloquial speech. Linguistic analysis and learning problems]. Moscow: Flinta; 2011. Co-published by the «Nauka». Russian.
10. Sharonov IA. Communicatives as a functional class and an object of lexicographic description. *Rusistika segodnya* [Russian philology today]. 1996;2:89–111. Russian.

11. Baranov AN, Krejdlin GE. The structure of the dialogue: lexical markers of the minimal dialogues. *Voprosy yazykoznaniya* [Questions of linguistics]. 1992;3:84–93. Russian.

12. Shirokova AG, Adamec P, Vlchek I. *Cheshskii yazyk* [The Czech language]. Moscow: Vysshaya shkola; 1988. Russian.

13. Karlík P, Nekula M, Pleskalová J. *Encyklopedický slovník češtiny* [Encyclopedic dictionary of the Czech Language]. Praga: Folk newspaper; 2002. Czech.

14. Mathesius V. [About systematic grammatical analysis]. In: Kondrashov NA, compiler, editor. *Prazhskii lingvisticheskii kruzhok* [Prague school]. 1967. p. 226–238. Russian.

15. Mathesius V. [An attempt to create theory of structural grammar]. In: Kondrashov NA, compiler, editor. *Prazhskii lingvisticheskii kruzhok* [Prague school]. 1967. p. 196–209. Russian.

16. Cholakova K. *Rechnik na bŭlgarskiya ezik. Tom 1. A–B* [Dictionary of the Bulgarian language. Volume 1. A–B]. Sofia: Publishing House of the Bulgarian Academy of Sciences; 1977.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 14.08.2018.*
*Received by editorial board 14.08.2018.*